**Тэма: Гук [ш ], літара Ш/ш**

**Мэта**:забяспячэнне знаёмства вучняў з літарай Ш/ш як знакам для абазначэння гука[ш] пры дапамозе асваення спосабаў дзеянняў;

**Задача:** распазнаваць у словах і выдзяляць гук [ш],абазначаць яго літарамі;

чытаць літару Ш/ш у складах,словах,сказах;

**Абсталяване**:буквар с.120-121,спадарожнік буквара с120-121,малюнкі шпака і шышкі,штангі,танцавальнай пары,якая танцуе танга, мяч, чырвоны, сіні, зялёны кружочкі для абазначэння гукавога аналізу слоў;

## Ход урока

**1.Псіхалагічны настрой на урок**

“-Ножкі на падлогу усе паставім,

Спінку праменька расправім,

Ручку левую на стол,
Зверху правую кладзём”

**2.Паведамленне тэмы ўрока**

-Да нас у госці сёння прыйшлі героі мультфільма “ Маша і Мядзведзь”. Наш Мішка хоча, каб мы навучылі Машу быць уважлівай, паслухмянай, дысцыплінаванай.Таму што толькі тады дзеці могуць чамусьці навучыцца.Дапаможам Мішцы?

-Сёння на ўроку мы працягнем знаёмства з новай літарай.Гэтая літара дапаможа нам даведацца, які гук літара ўмее абазначаць на пісьме, навучыць нас чытаць склады,словы ,сказы з ёй. А каб даведацца з якой літарай мы пазнаёмімся нам трэба адгадаць загадку.

“ Дом – палац стаіць высокі,

Нашых ведаў там вытокі.

Радасць свеціцца наўкола.

Ну, вядома, гэта***…(школа).***

-Які гук мы чуем у пачатку слова “школа”?.Гук [ш].

_ Я ўпэўнена, што за час вучобы ў школе вы  сталі сапраўднымі вучнямі. А якія правілы  павінны ведаць і выконваць школьнікі?

“- Форму школьную насіць, каб заўсёды аккуратным быць.

-Добры дзень умець сказаць, старэйшых трэба паважаць.

-У школу раней выходзь ,каб не спазніцца на ўрок,

Ну , а калі спазніўся, папрасі прабачэння і ў клас зайдзі.

-Хочаш ты пытанне задаць, або веды паказаць, руку трэба паднімаць і нікога не перабіваць.

**3.Выдзяленне  і характарыстыка  гука [ш].**

- І так дзеці, тэма нашага ўрока  Гук [ш], літара Ш/ш. Гэтая літара дапаможа нам даведацца, які гук яна ўмее абазначаць на пісьме, навучыць нас чытаць склады,словы ,сказы з ёй.

-Давайце дадзім характарыстыку гуку [ш].

На дошцы - выявы шпака і шышкі.Пасля знаёмства  чытаецца верш ,а дзецям патрэбна дагаварыць патрэбнае слова.

“ Зранку чуецца малаток,

Так шчыруе мала хто.

Прыпявае:

-Шпок – шпак,

Будзе мець кватэру …” ***(Шпак).***

-Як называецца кватэра шпака? ***(Шпакоўня)***

**Верш “Шышкі”**

Шышка з шышкаю сварыліся,

Шышка шышцы не скарылася.

Шышка шпарка долу шыганула

І сяброўку – шышку страсянула,

Шышкі ў шыгаллі мірыліся,

Што сварыліся – забыліся”

-Якое слова часта паўтараецца ў вершы? **(*Шышка)***

-Пра якія шышкі ідзе ў ім размова?***(Яловыя,сасновыя).***

-Ці ведаеце вы ,што такое “шыгалле?” (***Igліца, лісце хвойных дрэў і кустоў)***.

**а)гукавы аналіз слоў,выдзяленне і характарыстыка вывучаемага гука**.

У словах **“шпак” і “шышка”** выдзяляецца першы гук.

-Пры вымаўленні гэтага гука паветра сустракае перашкоду у роце. Чуецца шум.Гэты гук нельга праспяваць.Значыць гэты гук зычны. Усе зычныя гукі падзяляюцца на звонкія і глухія. Гэты гук – глухі.А яшчэ зычныя падзяляюцца на цвёрдыя і мяккія. Гэты гук – цверды.

**б)развіццё фанематычнага слыху.Распазнаванне гука [ш].**

-Я буду называць слова. Калі вы пачуеце гук**[ш]** у пачатку слова, падыміцеся на наскі і падыміце рукі ўверх.Калі ў сярэдзіне слова – стойце на месцы і разводзьце рукі ў бакі. Калі ў канцы слова – прысядайце. Калі ў слове няма гэтага гука – кружыцеся.

“ Ка**ш**уля,сукенка,**ш**орты,спадніца,**ш**аль, паліто, **ш**алік, камізэлька, пла**ш**ч, пальчаткі**, ш**апка, **ш**уба, капялю**ш**, **ш**таны.”

**в)падбор слоў з гукам [ш].**

Вучні самастойна падбіраюць словы з гукам **[ш].**

**4.Знаёмства з літарай Ш/ш.**

**а) увядзенне літары Ш/ш для абазначэння гука [ш].**

- Прыйшоў час пазнаёміцца з новай літарай. Гэта літара,якая абазначае гук **[ш].** Імя гэтай літары – **“ша”.(**дэманстрацыя літары на картцы).

- Літара **Ш** аба значае адзін зычны, глухі, цвёрды гук **[ш].** Імя літары і гук, які літара ўмее абазначаць, не супадаюць.

-Каб вымавіць літару, трэба вымавіць яе імя – **“ша”.**

-Каб прачытаць літару,трэба вымавіць цвёрды гук - **[ш].**

**б) графічны аналіз літары Ш/ш.**

-На што падобна літара **Ш/ш**?(чытанне верша с.120 спадарожніка буквара)

**5.Замацаванне атрыманых ведаў пра літару Ш/ш.**

- прагляд мультыплікацыйнага фільма з выкарыстаннем QR- кода на с.120 буквара.

**а) гукавы аналіз слоў, суаднясенне іх са схемамі.**

- разгадванне рэбуса ( **ш+ танец “Танга”= штанга)**

**6.Навучанне чытанню складоў і слоў з літарай Ш/ш.**

**а) чытанне складоў з выкарыстаннем прыёму “ Ракета”**

**б) чытанне слоў.**

**в) знаёмства з антонімамі. Гульня з мячом.**

*“Мала – шмат, меншы большы, вузкі – шырокі, ціш –гул, цішыня – шум, штыль – шторм”.*

Г) Чытанне сказаў. Адказы на пытанні з выкарыстаннем супрацьлеглы па сэнсе слоў. (с.121 буквара)

**7.Чытанне тэксту (с.121 буквара).**

**а) пытанні да тэксту**

- Як завуць герояў апавядання?

- Калі Грыша і Алесь вырашылі рабіць шпакоўні?

-Чаму менавіта вясной?

-Знайдзіце і прачытайце, як хлопчыкі майстравалі шпакоўні.Куды яны іх павесілі ?

- Знайдзіце і прачытайце той сказ тэксту, якому адпавядае малюнак.

**б) падбор загалоўка да тэксту** (“ Шпакоўні для птушак”, “ Кватэры для шпакоў”)

в) дыферэнцыраваная работа з вучнямі, якія добра чытаюць.(Верш М.Пазнякова **“ Косцік”**,с.121 спадарожніка буквара).

**8.Падвядзенне вынікаў урока.**

**а) рэфлексіўны аналіз дзейнасці вучняў.**

- З якім гукам і літарай сёння пазнаёміліся?

- Чаму навучыліся сёння на уроку?